## Культурна-масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК "Лунінецкая РЦБС" у кастрычніку

У бібліятэках прайшлі мерапрыемствы у рамках рэспубліканскай акцыі "Уважение. Забота. Ответственность" да Дня пажылога чалавека. Так, **1 кастрычніка** ў **ЦБ** арганізавалі вечар адпачынку "Чтоб осень была золотой», у **Дзятлавіцкай с.б.** прайшоў літаратурна-музычны вечар для ветэранаў бібліятэчнай працы "Вам дарим доброту и радость", у **Кажан-Гарадоцкай** сельскай бібліятэцы-клубе віншавалі старэйшых удзельнікаў народнага фальклорнага калектыву "Надзея", які працуе пры бібліятэцы-клубе. Супрацоўнікі **Дрэбскай** і **Люшчанскай** сельскіх бібліятэк-клубаў наведалі на даму доўгажыхароў, адзінокіх сталых аднавяскоўцаў.

**4 кастрычніка.** Бібліятэкар **Лунінецкай гарадской бібліятэкі мікрараёна "Сельгастэхніка"** для выхаванцаў дзіцячага садка №6 арганізавала літаратурную сустрэчу з вядомай дзіцячай пісьменніцай Пін934шчыны Нінай Енбулаевай. Спачатку бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з біяграфіяй пісьменніцы і яе кнігамі. Ніна Кузьмінічна расказала дзецям пра свае зборнікі вершаў і загадак "Бабушкин сундучок", "Звезда на ладошке", "Кошка на окошке".

**8 кастрычніка. ЦБ.** У чытальнай зале адбыўся юбілейны творчы вечар "Я люблю тебя, жизнь", прысвечаны юбілею ўдзельніка народнай літаратурна-паэтычнай студыі "Литературная провинция" Аляксандра Рыгоравіча Бекеша. Павіншаваць літаратара з юбілеем прыйшлі члены студыі, сябры і бібліятэкары цэнтральнай раённай і цэнтральнай дзіцячай бібліятэк. Добрым дапаўненнем да мерапрыемства стала відэа-прэзентацыя ад старшыні студыі Віктара Пінігіна, прысвечаная Аляксандру Бекешу. Аляксандр Рыгоравіч расказаў пра свае жыццё, прачытаў уласныя вершы і падарыў усім музычнае віншаванне.

З **14 па 21 кастрычніка** ў Рэспубліцы Беларусь адзначаўся **Тыдзень бацькоўскай любві.** Пачаўся гэты тыдзень Днём маці і скончыўся Днём бацькі. У бібліятэках ДУК "Лунінецкая РЦБС" праходзіў тэматычны цыкл мерапрыемстваў, прымеркаваны да свят.

**8 кастрычніка. Мікашэвіцкая г. б**. Для вучняў 6 класа гімназіі ім.У.І. Нядзведскага прайшла літаратурна-музычная замалёўка «Весь мир начинается с мамы». А **10 кастрычніка** гэта мерапрыемства правялі для вучняў 7 класа гімназіі.

**11 кастрычніка. Мікашэвіцкая г.б**. Для вучняў 9 класа гімназіі ім.У.І.Нядзведскага правялі паэтычную гадзіну "Букет из самых нежных чувств". Удзельнікі мерапрыемства даведаліся пра гісторыю святкавання Дня маці. Затым навучэнцы чыталі вершы пра маці, удзельнічалі ў "Кулінарнай віктарыне" і конкурсах "Угадай кветку", "Вялікая пакупка" і інш. У заключэнні мерапрыемства ўсе ўдзельнікі напісалі свае віншаванні маці.

**14 кастрычніка. ЦБ.** У чытальнай зале бібліятэкі для выхаванцаў адзялення дзённага знаходжання для інвалідаў Лунінецкага ТЦСАН адбыўся майстар-клас па вырабе паштоўкі для мам.

Таксама ў бібліятэцы прайшоў сямейны вечар з мнагадзетнай сям'ёй Барысавых "Святая Троица земли: ребёнок, мать, отец". Бацька сямейства, настаяцель храма Казанскай іконы Божай Маці (в.Рэдзігерава), іерэй Аляксандр Барысаў пазнаёміў прысутных са сваёй дружнай сям'ёй. Матушка Іна і усе чацвёра сыноў расказалі пра сябе і агучылі свае мары.

**17 кастрычніка. Мікашэвіцкая г.б**. Прайшла гадзіна забавы "Папа может всё, что угодно!" для дзяцей 5 класа СШ №2. Пад час мерапрыемства школьнікі даведаліся пра гісторыю ўзнікнення Дня бацькі, удзельнічалі ў конкурсах, адгадвалі загадкі аб прафесіях тат і малявалі партрэты сваіх тат.

**18 кастрычніка. ЦБ**. Напярэдадні Дня бацькі адбылася пазнавальная гадзіна "Мой отец – семьи опора", дзе ўдзельнікам мерапрыемства расказалі пра ролю бацькі ў сям'і і грамадстве. Працягнулася мерапрыемства літаратурнай гульнёй "Кніжныя таты", падчас якой удзельнікі ўспомнілі пісьменнікаў, творы якіх прысвечаны татам.

**19 кастрычніка. Мікашэвіцкая г.б**. Для ўдзельнікаў клуба "САМІ" прайшла літаратурна-забаўляльная праграма "Мой папа самый лучший".

У сельскіх бібліятэках прайшлі мерапрыемствы ў рамках Тыдня бацькоўскай любві. Так, у **Дрэбскай** сельскай бібліятэцы-клубе прайшла акцыя "Мама и папа – глазами ребёнка". З дапамогай фатаграфій, малюнкаў, вершаў была намалявана сценгазета, якая стала добрым падарункам ўсім мамам і татам, якія наведалі бібліятэку у гэтыя дні. У **Сінкевіцкай с.б.** прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя "Слово о матери", у **Бастынскай с.б** - «Всё на земле от материнских рук», у **Любанскай с.б.** прайшла музычна-забаўляльная праграма «Загляните в мамины глаза», у **Бродніцкай** сельскай бібліятэцы-клубе – урок дабрыні «Мы папе посвящаем строки» і інш.

**18 кастрычніка. ЦБ.** Супрацоўнікі бібліятэкі і народная літаратурна-паэтычная студыя "Литературная провинция" прынялі ўдзел у мерапрыемстве, арганізатарам якога стала цэнтральная бібліятэка горада-пабраціма Лунінца Палеска. Мерапрыемства праходзіла ў рамках Дней літаратуры Калінінградскай вобласці і прысвячалася памяці паэтаў літаратурнага аб'яднання «Высокая строфа». Ад лунінецкіх літаратараў выступілі ўдзельнікі "Літаратурнай правінцыі" Віктар Пінігін, Вольга Грыдзюшка і Анастасія Пратасавіцкая. Яны прачыталі вершы на беларускай мове.

У **рамках спецыяльнай праграмы "Детство без насилия"**, якая праходзіла з 7 па 31 кастрычніка ў бібліятэках прайшлі прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на абарону дзяцей ад гвалту і жорсткага абыходжання.

**24 кастрычніка. ЦДБ.** Адбылася прафілактычная гутарка «Мы против насилия» з удзелам вучняў 8 "Б" класа СШ №3 г.Лунінца. На мерапрыемстве прысутнічаў маёр міліцыі Луніненцкага РАУС Дзяніс Іванавіч Баярын. Былі абмеркаваны пытанні прафілактыкі злачынстваў супраць жыцця, здароўя, палавой недатыкальнасці непаўналетніх. Да мерапрыемства была аформлена тэматычная кніжная выстава "Формула бяспекі дзяцінства".

**25 кастрычніка. ЦБ.** Для вучняў 9 класа СШ №1 г Лунінца адбылася прафілактычная гутарка «Детство без насилия».Запрошая на мерапрыемства

урач псіхатэрапеўт Валерыя Валер'еўна Болтуць падзялілася тэлефонам даверу, дала рэкамендацыі аб тым, што неабходна зрабіць, калі сябар знаходзіцца ў крызісным стане, бо ўвага навакольных можа прадухіліць бяду.
**29 кастрычніка. ЦБ.** Супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі бралі ўдзел у юбілейных XY Свята-Андрэеўскіх адукацыйных чытаннях. Мерапрыемства праводзілася ў рамках XXXIII Міжнародных Калядных адукацыйных чытанняў, і было прысвечана тэме "80-годдзе Вялікай Перамогі: памяць і духоўны вопыт пакаленняў". Загадчык адзела абслугоўвання і інфармацыі А.С.Гнедзька пазнаёміла слухачоў з навінкамі духоўна-асветніцкай літаратуры, прадстаўленай на кніжнай выстаўцы "Прыгажосць Божага свету". Благачынны Лунінецкай акругі протаіерэй Сергій Крышталь уручыў падзячны ліст А.С.Гнедзька за актыўны ўдзел у чытаннях.
**30 кастрычніка. ЦБ.** Адбыўся адкрыты дыялог адвакатаў юрыдычнай кансультацыі Лунінецкага раёна Тамары Аляксандраўны Грыцкевіч і Наталлі Іванаўны Чухліб з супрацоўнікамі цэнтральнай раённай і цэнтральнай дзіцячай бібліятэк. У ходзе размовы абмяркоўваліся спосабы праяўлення экстрэмізму, маральныя аспекты супрацьпраўных экстрэмісцкіх дзеянняў, меры адказнасці за ўчыненне злачынстваў экстрэмісцкай накіраванасці, правілы паводзін пры ўзнікненні нестандартных сітуацый і інш.